4. Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг. В 2 кн. Кн. 2 / А. А. Коваленя [и др.]; НАН Беларуси. Ин-т истории; Редкол. : А. А. Коваленя [и др.]. – Минск : Беларуская навука, 2014. – Кн.2 –335 с.
5. *Трофимчик, А. В.* Религия и идеология в школе западных областей БССР (1939–1941 гг.) / А. В. Трофимчик // Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа : зб. навук. арт. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, ГрДУ імя Я. Купалы, Ін-т гіст. НАНБ; рэдкал. : С. В. Марозава [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 2008. – С. 144–147.
6. *Jarmusik, E.* Zycie religijne w Zachodnich regionach Bialorusi (1939–1941 R.) / E. Jarmusik // LIX Rocznik Polskiego Towarzystwa Naukowego na Obczyznie (rok 2015/2016). – Lomanki : L.T.W. – 2017. – С. 58–70.

УДК 94(476)"19"+329.78(476)(091)"19"

# ПРАЦЭС АДНАЎЛЕННЯ МОЛАДЗІ Ў ПРАВАХ ЧЛЕНАЎ ЛКСМБ У СЯРЭДЗІНЕ – ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1940-х гг.

**А. У. Кімбар**

*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Мінскі гарадскі педагагічны каледж», вул. Макаёнка, 29, 220114, г. Мінск, andrejkimbar@gmail.com*

У артыкуле разлядаюцца асаблівасці аднаўлення Ленінскага камуністычнага саюза моладзі Беларусі пасля Вялікай Айчыннай вайны. На падставе архіўных крыніц аўтар разглядае працэс аднаўлення моладзі ў правах членаў саюза, прычыны выключэння моладзі з шэрагаў камсамольскіх арганізацый і спробы абскарджвання рашэнняў гарадскіх і раённых камітэтаў камсамола аб выключэнні членаў.

***Ключавыя словы:*** БССР; камсамол; ЛКСМБ; апеляцыя; моладзь.

# ПРОЦЕСС ВОССТАНОВЛЕНИЯ МОЛОДЕЖИ В ПРАВАХ ЧЛЕНОВ ЛКСМБ В СЕРЕДИНЕ – ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ 1940-х гг.

**А. В. Кимбор**

*Государственное учреждение образования «Минский городской педагогический колледж», ул. Макаёнка, 29, 220114, г. Минск, andrejkimbar@gmail.com*

В статье подробно рассматриваются особенности восстановления Ленинского коммунистического союза молодежи Беларуси после Великой Отечественной войны. На основе архивных источников автор исследует процесс восстановления молодёжи в правах членов союза, причины исключения молодёжи из рядов комсомольских организаций, попытки обжалования решений городских и районных комитетов комсомола об исключении членов.

***Ключевые слова:*** БССР; комсомол; ЛКСМБ; апелляция; молодежь.

# THE PROCESS OF YOUTH REINSTATEMENT AS MEMBERS OF THE LKSM IN THE MIDDLE – SECOND HALF OF THE 1940s

**A. Kimbar**

*State educational institution "Minsk City Pedagogical College", Makayonka str. 29, 220114, Minsk, andrejkimbar@gmail.com*

The article details the features of the restoration of the Leninist Communist Youth Union of Belarus after the Great Patriotic War. On the basis of archival sources, the author examines the process of youth reinstatement as union members, the reasons for the exclusion of youth from the ranks of Komsomol organizations, and attempts to appeal the decisions of city and district Komsomol committees on the exclusion of members.

***Keywords:*** BSSR; Komsomol; LKSMB; appeal; youth.

Пасля вызвалення тэрыторыі Беларусі ад нямецка-фашысцкай акупацыі паступова аднаўлялася сетка арганізацый Ленінскага камуністычнага саюза моладзі Беларусі (далей – ЛКСМБ), які з'яўляўся складовай часткай Усесаюзнага ленінскага камуністычнага саюза моладзі (далей – УЛКСМ). У айчыннай гістарыяграфіі дадзены працэс знайшоў адлюстраванне ў даследаваннях А. Я. Журава [1], А. У. Люцко [2], а таксама шэрагу калектыўных работ, прысвечаных дзейнасці камсамола рэспублікі. Пры гэтым, у дадзеных работах увага надаецца ў першую чаргу колькасным паказнікам: аўтары ўказваюць на колькасць арганізацый і іх членаў, але не прасочваюць механізм аднаўлення моладзі ў правах членаў ЛКСМБ пасля Вялікай Айчыннай вайны, прычыны выключэння моладзі з шэрагаў камсамольскіх арганізацый. Таксама не разглядаюцца выпадкі падачы апеляцый на аднаўленне членства ў ЛКСМБ.

Мэтай дадзенай работы з'яўляецца разгляд працэсу аднаўлення моладзі ў правах членаў ЛКСМБ у сярэдзіне – другой палове 1940-х гг.

У якасці крыніц выкарыстоўваюцца матэрыялы справаводства ЛКСМБ: справаздачы ЦК ЛКСМБ, выпіскі з пратаколаў і рашэнняў пасяджэнняў бюро ЦК ЛКСМБ, інфармацыі гарадскіх, раённых і абласных камітэтаў камсамола, тэлеграмы і іншыя дакументы. Дадзены корпус крыніц дазваляе дэталёва прасачыць усе этапы аднаўлення моладзі ў правах членаў ЛКСМБ, а таксама дзеянні грамадзян у выпадку адмовы ў аднаўленні.

Па меры аднаўлення камсамольскіх арганізацый на тэрыторыі Беларусі з 1943 па 1945 г. кіруючыя камсамольскія органы збіралі інфармацыю пра моладзь, якая заставалася на тэрыторыі рэспублікі падчас вайны. З гэтай мэтай райкамы і гаркамы ЛКСМБ накіроўвалі ў населеныя пункты, установы, прадпрыемствы сваіх упаўнаважаных асоб, якія праводзілі

рэгістрацыю камсамольцаў, высвятлялі, чым займалася моладзь у гады акупацыі. Кожны камсамолец пісаў заяву аб аднаўленні яго ў камсамоле і тлумачэнне таго, што рабіў у гады акупацыі [2, с. 3]. Разгляд асабістых спраў камсамольцаў, якія засталіся на акупаванай тэрыторыі, паўсюдна быў скончаны ў студзені 1945 года [11, арк. 92].

У справаздачы ЦК ЛКСМБ адзначалася, што ўсяго ў раёнах Беларусі па стане на студзень 1945 г. прайшлі рэгістрацыю 46 600 камсамольцаў. Сярод тых, хто прайшоў рэгістрацыю, 10 750 камсамольцаў былі партызанамі і падпольшчыкамі падчас Вялікай Айчыннай вайны. Пры вызваленні тэрыторыі Беларусі многія партызанскія брыгады і атрады ўліваліся ў склад дзейнай Чырвонай арміі неадкладна пасля злучэння з ёй, таму рэгістрацыю не праходзіла асноўная частка камсамольцаў-партызан і падпольшчыкаў – звыш 55 000 чалавек.

З ліку тых, хто прайшоў рэгістрацыю, захавалі камсамольскія білеты 5 500 чалавек. Як адзначалася, «за выключэннем асобных выпадкаў, таварышы, якія захавалі камсамольскія білеты, сваімі паводзінамі нічым не зганьбілі [сябе] перад Радзімай і камсамолам». 41 100 камсамольцаў, ці 87 % з ліку тых, хто прайшоў рэгістрацыю, камсамольскія білеты знішчылі [11, арк. 92]: верагодна, гэта было звязана з небяспекай праследу з боку акупацыйнай улады падчас вайны.

Райкамы і гаркамы ЛКСМБ разгледзелі 38 300 асабістых спраў камсамольцаў. Адноўлена ў правах членаў ЛКСМБ і прынята на камсамольскі ўлік было 36 360 чалавек. За супрацоўніцтва з акупацыйнай уладай і калабарацыяніскімі арганізацыямі было выключана 3 155 чалавек. 1 285 чалавекам па розных прычынах было адмоўлена ў аднаўленні ў камсамоле. На 1 440 камсамольцаў былі накладзены камсамольскія санкцыі, у тым ліку 883 камсамольцам з занясеннем ва ўліковую картку. Саюзныя спагнанні на камсамольцаў накладаліся пярвічнымі арганізацыямі і райкамамі, гаркамамі камсамола ў асноўным за неабгрунтаванае знішчэнне камсамольскіх білетаў і праяўленую пасіўнасць падчас акупацыі.

Некаторыя райкамы і гаркамы ЛКСМБ марудна разглядалі асабістыя справы, таму 7 800 чалавек пакінулі БССР, не аформіўшы сваіх спраў аб прыналежнасці да камсамола [11, арк. 93].

Былыя члены камсамола мелі права на апеляцыю і аднаўленне ў правах члена, чым яны і карысталіся. Апеляцыі мелі разнастайны характар і накіроўваліся ў абласныя камітэты ЛКСМБ у выпадках, калі рашэнне аб выключэнні прымалася райкамам ці гаркамам, альбо ў ЦК ЛКСМБ, калі рашэнні абкамаў не задавольвалі грамадзян.

Напрыклад, камсамолец М. Д. Ткачоў са жніўня 1941 г. па снежань 1943 г. знаходзіўся на акупіраванай тэрыторыі. Больш за год ён працаваў на чыгуначнай станцыі «Гомель» сцэпшчыкам вагонаў, а пасля стрэлачнікам. Са

снежня 1943 г. па сакавік 1945 г. ён знаходзіўся ў шэрагах Чырвонай арміі. Пасля ўладкаваўся на працу інструктарам Гомельскага гаркама ЛКСМБ, не паведаміўшы пра свае заняткі падчас акупацыі. Акрамя таго, М. Д. Ткачоў падрабіў дакументы і ад імя гаркама атрымаў 16 м. кв. шкла, якое выкарыстаў у сваіх мэтах, займаўся спекуляцыяй. Пасля выкрыцця сваіх учынкаў быў выключаны са складу ЛКСМБ, але спрабаваў абскардзіць рашэнне ў сакавіку 1946 г. Яго апеляцыя была скасаваная [4, арк. 4].

Р. Д. Грыб падчас нямецкай акупацыі вучылася ў фельчарскай школе Мінска, дзе ўступіла ў Саюз беларускай моладзі і прымала актыўны ўдзел у яго рабоце. У снежні 1946 г. яна спрабавала аднавіцца ў ЛКСМБ. Але яе выключэнне было зацверджана [6, арк. 47].

У ліпені 1946 г. Н. І. Цубрыкава спрабавала абскардзіць сваё выключэнне з камсамола. Падчас разгляду яе справы было высветлена, што ў гады акупацыі яна працавала настаўнікам у школе, якая была адкрытая нямецкай уладай, не прымала ніякага ўдзелу ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, акрамя таго, «мела сувязь са здраднікамі Радзімы». Пасля вызвалення рэспублікі нідзе не працавала. Бюро ЦК ЛКСМБ прыняло рашэнне зацвердзіць пастанову абкама камсамола аб яе выключэнні са складу арганізацыі [4, арк. 5].

Аднак часам апеляцыі атрымлівалі станоўчы вынік. Так, 26 мая 1946 г. В. Ф. Бурая была выключана з членаў камсамола рашэннем Мінскага абкама ЛКСМБ за тое, што была жонкай супрацоўніка гестапа і перадавала немцам інфармацыю пра партызан. Пры праверцы было высветлена, што муж Бурай Свірыдаў быў арыштаваны ў 1942 г. і вывезены немцамі ў Магілёў, далейшы яго лёс невядомы. Сама Вера Фёдараўна не толькі не мела сувязі з немцамі, але дапамагала партызанам у Бярэзінскім раёне. Пасля высвятлення гэтых дадзеных бюро ЦК ЛКСМБ прыняло пастанову аб адмене рашэння Мінскага абкама аб выключэнні В. Ф. Бурай з членаў камсамола, але з камсамольскага ўліку яна была знятая ў адпаведнасці са статутам УЛКСМ, бо з’яўлялася пераросткам [5, арк. 24].

У лютым 1947 г. было адменена рашэнне Чыгуначнага райкама камсамола Гомеля аб выключэнні К. Г. Шчэрбы з камсамола за працу перакладчыцай для немцаў у гады акупацыі. Праверка паказала, што яна не была перакладчыцай і не мела сувязей з акупацыйнымі ўладамі, хаця яе айчым з’яўляўся здраднікам і працаваў следчым у немцаў [7, арк. 40].

Сярод камсамольскіх упаўнаважаных асоб, якія займаліся праверкай моладзі, назіраліся злоўжыванні сваімі абавязкамі і пасадай. Так, у Веткаўскім раёне разглядалася пытанне аб аднаўленні дзвюх настаўніц у правах членаў УЛКСМ. Рыхтаваць інфармацыю па дадзеным пытанні на бюро даручылі пазаштатнаму інструктару. Гэты інструктар наведаў вёску, дзе пражывалі настаўніцы, і пачаў рыхтаваць матэрыял на пасяджэнне бюро.

Ён звярнуўся да адной з настаўніц з такімі словамі: «Мілая, ты знаходзілася на акупіраванай тэрыторыі, занятай нямецкімі акупантамі. Калі ты не паставіш мне паўбутэлькі [гарэлкі], я дам табе дрэнную характарыстыку і райкам камсамола цябе не аднавіць, а калі паставіш – я табе гэта забяспечу». Як адзначалася ў далейшых разбіральніцтвах, спачатку настаўніца разгубілася, паабяцала выканаць патрабаванне, і інструктар стаў рыхтаваць станоўчы матэрыял. Потым настаўніца падумала, што яна сябе нічым не скампраметавала, і не выканала абяцанага. Тады пазаштатны інструктар камсамола падрыхтаваў іншы матэрыял пра тое, што гэтая настаўніца гуляла з немцамі, вучыла дзяцей у нямецкай школе. Райкам камсамола быў гатовы вырашыць пытанне аб аднаўленні не на яе карысць, але на пасяджэнні прысутнічаў сакратар абкама КП(б)Б Бугаёў, які пацікавіўся падрабязнасцямі. Настаўніца распавяла яму ўсю гісторыю [3, арк. 71].

Такі выпадак не быў адзінкавым у Гомельскай вобласці. Першы сакратар абкама ЛКСМБ Бабкоў адзначаў, што «ў нас ёсць і іншыя факты. Напрыклад, настаўніцы, якія нідзе не працавалі, нічым сябе не скампраметавалі, будучы на акупіраванай тэрыторыі, але яны не падаюць заявы з просьбай аднаўлення ў правах членаў УЛКСМ і кажуць, што навошта гэта рабіць, нас усё роўна ў камсамоле не адновяць». Таксама ён адзначаў, што «такое становішча прывяло да таго, што частку інтэлігенцыі мы літаральна адштурхнулі ад сябе, маем да яе недавер, не праяўляем да нашай агітацыйна-прапагандысцкай работы і ў першую чаргу па арганізацыйнай прапагандзе» [3, арк. 71].

У 1945 г. Ельскі райкам ЛКСМБ прыняў рашэнне аб выключэнні з камсамола К. С. Цалко, а таксама паставіў пытанне перад райкамам партыі аб звальненні яе з працы. Сама камсамолка не бачыла прычын для такіх захадаў і накіравала апеляцыю ў абкам ЛКСМБ. Абкам «бюракратычна» паставіўся да гэтай справы. У дадзеным выпадку пад «бюракратычным» стаўленнем неабходна разумець тое, што зварот доўгі час не разглядаўся. Рашэнне па гэтай апеляцыі было прынята толькі праз год – у снежні 1946 г. Акрамя таго, супрацоўнікі абкама не праводзілі ніякіх разбіральніцтваў, а проста зацвердзілі рашэнне райкама, дадаўшы да яго, што К. С. Цалко несумленна ставілася да сваёй працы і «няправільна паводзіла сябе ў побыце». Караліна Станіславаўна працягнула абскарджваць гэтае рашэнне. У маі 1947 г. бюро ЦК ЛКСМБ пасля падрабязнага разбору гэтай справы прыняло рашэнне аб аднаўленні К. С. Цалко ў камсамоле і вынясенні папярэджання Палескаму абкаму ЛКСМБ аб недапушчальнасці выпадкаў бюракратычнага стаўлення да разбору асабістых спраў камсамольцаў [9, арк. 91].

Прычынай выключэння з камсамола маглі выступаць і сямейныя скандалы. Так, Н. В. Паўлёнак выконвала грамадскае даручэнне і з'яўлялася загадчыцай бібліятэкі, якая размяшчалася ў завадскім камітэце партыі Гомельскага вагонарамонтнага завода. Там яна сустракалася са старшынёй камітэта партыі Шантаровічам. Дадзеныя сустрэчы мелі дзелавы характар,

але паступова перараслі ва ўзаемную сімпатыю. Паўлёнак і Шантаровіч наведвалі кіно, тэатр, вечарыны. Гэта стала вядома жонцы Шантаровіча, якая звярнулася ў Чыгуначны райкам ЛКСМБ Гомеля з заявай, дзе ўказала, што муж змяніў сваё стаўленне да яе і не выконваў абавязкі па выхаванні дзяцей. Абкам прыняў рашэнне аб выключэнні Н. В. Паўлёнак з камсамола. Яна падала апеляцыю ў ЦК ЛКСМБ. Праводзіліся дадатковыя разбіральніцтвы, і ў ліпені 1947 г. рашэнне Гомельскага абкама было адменена, «прымаючы да ўвагі гарачае жаданне тав. Паўлёнак знаходзіцца ў шэрагах УЛКСМ, … тым больш, што тав. Шантаровіч як член кампартыі ніякіх пакаранняў не атрымаў» [10, арк. 61]. Цікава, што Паўлёнак у лютым 1947 г. выйшла замуж за вайскоўца, разам з якім накіравалася ў Вену [10, арк. 62], дзе і атрымала тэлеграму з вынікамі пасяджэння бюро ЦК ЛКСМБ, на якім абмяркоўвалася яе апеляцыя [10, арк. 59].

Яшчэ адной з асноўных прычын зняцця з камсамольскага ўліку было невыкананне сваіх службовых абавязкаў. Напрыклад, П. М. Караленка быў зняты з пасады першага сакратара Барысаўскага райкама ЛКСМБ за грубае парушэнне фінансавай дысцыпліны, якое праяўлялася ў раскраданні сродкаў, што былі сабраныя ў фонд дапамогі дзецям-сіротам, і падробцы фінансавых дакументаў [4, арк. 7].

В. І. Барысенка з 1941 г. па 1944 г. знаходзіўся ў арміі. У 1944 г. дэмабілізаваўся па інваліднасці, пасля чаго сем месяцаў быў старшынёй калгаса. 11 красавіка 1946 г. Гомельскі абкам ЛКСМБ выключыў яго з членаў УЛКСМ за спекуляцыю і хуліганства. У студзені 1947 г. падчас разгляду апеляцыі бюро ЦК ЛКСМБ, «улічваючы, што тав. Барысенка добрасумленна працаваў у калгасе і асэнсаваў зробленую ім памылку», адмяніла рашэнне абкама, замяніўшы яго на вымову з занясеннем ва ўліковую картку [5, арк. 25].

У чэрвені 1946 г. С. Я. Шустарман была выключаная з членаў УЛКСМ Палескім абкамам ЛКСМБ за самавольны сыход з працы піянерважатай і невыкананне пастаноў бюро абкама камсамола. Пры разглядзе апеляцыі з улікам таго, што Сафія Яўсееўна актыўна ўдзельнічала ў рабоце камсамольскай арганізацыі, бюро ЦК ЛКСМБ прыняло рашэнне аднавіць яе членства, але вынесці вымову з занясеннем у асабістую справу [7, арк. 37].

Часта кепскае выкананне службовых абавязкаў магло стаць прычынай больш глыбокага разбіральніцтва, якое, у сваю чаргу, магло выкрыць іншыя правіннасці. Так, Гомельскі абкам ЛКСМБ пачаў разбіральніцтва ў дачыненні да Г. Д. Собаль у сувязі з кепскім выкананнем абавязкаў кіраўніка піянерскай арганізацыі. Высветлілася, што Ганна Данілаўна працавала ў нямецкай установе ў гады акупацыі [10, арк. 58].

У красавіку 1947 г. разглядалася апеляцыя М. Н. Петрусевіча, які быў выключаны з членаў УЛКСМ Магілёўскім абкамам за ўхіленне ад службы ў арміі і ўтойванне падчас аднаўлення ў камсамоле таго, што падчас акупацыі служыў у паліцыі [8, арк. 23].

Кіраўніцтва камсамольскіх арганізацый магло прыкрываць недахопы сваёй работы абвінавачваннямі камсамольцаў. Так, Р. Я. Каспіна была выключаная з камсамола за безадказнае стаўленне да выканання сваіх абавязкаў. Яна абвінавачвалася ў неахайным захоўванні камсамольскіх дакументаў і страце 20 камсамольскіх значкоў. Расследаванне бюро ЦК ЛКСМБ выкрыла, што гэтыя значкі былі скрадзеныя ў будынку райкама камсамола былой старшынёй Свяцілавіцкага райпа Саковіч, якая пазней была выключана з камсамола за крадзеж рэчаў у інтэрнаце. Абвінавачаная ў страце значкоў Каспіна неаднаразова папярэджвала першага сакратара Свяцілавіцкага райкама Суркову пра неабходнасць набыцця жалезных скрынь для захоўвання і замены замкоў, але апошняя ігнаравала гэта [10, арк. 65].

Такім чынам, з 1943 г. пачынаецца аднаўленне і стварэнне новых камсамольскіх арганізацый на тэрыторыі БССР. Для таго, каб узнавіць правы члена ЛКСМБ, моладзі, якая пражывала на тэрыторыі Беларусі ў гады нямецкай акупацыі, неабходна было прадставіць інфармацыю пра свае дзеянні ў гэты час. Частка былых камсамольцаў была пазбаўлена магчымасці аднавіцца ў ЛКСМБ. Прычынай такой адмовы магла стаць работа ва ўстановах і прадпрыемствах, якія кантраляваліся акупацыйнай уладай, сувязь з акупацыйнай адміністрацыяй і карнымі органамі, членства ў калабарацыяністскіх арганізацыях, выкрыццё партызан і падпольшчыкаў і інш. Акрамя таго, моладзь, якая была адноўленая ў камсамоле, магла быць выключаная з арганізацыі за невыкананне палажэнняў статута, безадказнае выкананне сваіх працоўных абавязкаў, амаральныя паводзіны.

Некаторыя з тых, хто быў выключаны з камсамола, спрабавалі абскардзіць рашэнні мясцовых арганізацый шляхам падачы апеляцый у вышэйстаячыя органы. Рашэнні гаркамаў і райкамаў ЛКСМБ маглі быць абскарджаныя ў абкамах, рашэнні абкамаў – у ЦК ЛКСМБ. Акрамя таго моладзь мела права звярнуцца ў ЦК УЛКСМ. Звычайна скаргі камсамольцаў на несправядлівае выключэнне з арганізацыі разглядаліся на пасяджэннях бюро ЦК ЛКСМБ.

Нярэдка разгляд апеляцый упаўнаважанымі прадстаўнікамі ЦК ЛКСМБ прыводзіў да выкрыцця недахопаў у рабоце райкамаў, гаркамаў і абкамаў камсамола. Выкрываліся факты карупцыі, злоўжывання пасадамі і паўнамоцтвамі, абыякавасць і халатнасць пры разглядзе асобных выпадкаў на месцах. У той жа час паўторны разгляд спраў аб выключэнні з камсамола мог прывесці да выкрыцця больш глыбокіх правіннасцяў з боку камсамольцаў.

## Бібліяграфічны спіс

1. *Жураў, А. Я.* У баях народжаны: кароткі нарыс гісторыі камсамола Беларусі. – Мінск: Народная асвета, 1970. – 221, [1] с.

2. *Люцко, А. В.* Восстановление комсомольских органов в Белоруссии после освобождения республики от немецко-фашистских захватчиков (1943–1945 гг.) / правл. о-ва «Знание» БССР. – Мн., 1972. – 18 с.

3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 63п. Воп. 9. Спр. 14.
4. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 15. Спр. 18.
5. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 15. Спр. 19.
6. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 15. Спр. 20.
7. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 15. Спр. 21.
8. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 15. Спр. 25.
9. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 15. Спр. 27.
10. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 15. Спр. 31.
11. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 17. Спр. 3.

УДК 327:339(476)+(560)

# СТРАТЕГИЧЕСКИЕ НАПРАВЛЕНИЯ БЕЛОРУССКО-ТУРЕЦКОГО СОТРУДНИЧЕСТВА

**Н. В. Кошелева**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, uddijana@gmail.com*

Геополитическое положение Республики Беларусь и Турецкой Республики во многом определяет большие возможности развития двусторонних отношений как в области политики, так и в экономической сфере. Белорусско-турецкое сотрудничество прошло через целый ряд этапов, развивалось несколько неравномерно, но в целом по восходящей траектории. Однако в связи с санкционной политикой Запада в отношении Беларуси и эскалацией региональной напряженности в Восточной Европе потенциал двустороннего сотрудничества реализован не полностью.

***Ключевые слова:*** Республика Беларусь; Турецкая Республика; двусторонние отношения; экономическое сотрудничество; политическое взаимодействие.

# STRATEGIC DIRECTIONS OF BELARUSIAN-TURKISH COOPERATION

**N. V. Kosheleva**

*Belarusian State University, Independence Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus, uddijana@gmail.com*

The geopolitical position of the Republic of Belarus and the Republic of Turkey largely determines the great opportunities for the development of bilateral relations both in the field of politics and in the economic sphere. Belarusian-Turkish cooperation has gone through a number of stages, developing somewhat unevenly, but overall along an upward trajectory. However, due to the Western sanctions policy towards Belarus and the escalation of regional tensions in Eastern Europe, the potential of bilateral cooperation has not been fully realized.

***Keywords:*** Republic of Belarus; Republic of Turkey; bilateral relations; economic cooperation; political interaction.